*Лаўшук Аляксей Сцяпанавіч*
кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дэкан педагагічнага факультэта
МДУ імя А.А. Куляшова

# НАВУКОВАЯ ПРАЦА НА ПЕДАГАГІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ НА ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ: ЗДАБЫТКІ І ПРАБЛЕМЫ

Шаноўныя калегі, сённяшняя навукова-практычная канферэнцыя прысвечана 100-гадоваму юбілею Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова. У гэтым годзе юбілейная дата і ў педагагічнага факультэта. Сёлета педфаку – 55. І паколькі ў юбілейныя даты гавораць аб сваіх здабытках, скажам аб гэтым і мы.

Педагагічны факультэт налічвае 38 штатных выкладчыкаў, у тым ліку 1 доктар навук, дацэнт; 16 кандыдатаў навук, дацэнтаў. У складзе факультэта 3 кафедры: педагогікі і методыкі пачатковага навучання, беларускай і рускай моў і кафедра музычнага выхавання і харэаграфіі.

Самай сталай кафедрай на факультэце з'яўляецца кафедра педагогікі і методыкі пачатковага навучання (першапачатковая яе назва – псіхалогіі і методыкі пачатковага навучання). Першым загадчыкам названай кафедры была Зарудная Ганна Апанасаўна, вядомы вучоны-псіхолаг, аўтар падручніка па псіхалогіі для вышэйшых навучальных устаноў. Пасля ліквідацыі геафака на кафедру прыйшлі вядомыя ў рэспубліцы вучоныя – Мікалай Станіслававіч Ратабыльскі і Пётр Аляксеевіч Лярскі. Для студэнтаў педагагічных факультэтаў гэтыя таленавітыя вучоныя выдалі вучэбныя дапаможнікі “Геаграфія” і “Землязнаўства і краязнаўства”. Па гэтых кнігах вучылася не адно пакаленне студэнтаў, у тым ліку і цяперашні загадчык кафедры педагогікі і методыкі пачатковага навучання – Старавойтава Таццяна Аляксееўна.

Кафедра распрацоўвае такія актуальныя на сённяшні дзень навуковыя тэмы, як “Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне вучняў агульнаадукацыйнай школы” і “Стварэнне крэатыўнага адукацыйнага асяроддзя на 1 ступені агульнай сярэдняй адукацыі”. Вынікам мэтанакіраванай працы па гэтых тэмах стаў выпуск шэрагу падручнікаў з грыфам МА РБ.

Разам з утварэннем педагагічнага факультэта была створана і кафедра музычнага выхавання. Доўгі час гэту кафедру ўзначальваў таленавіты музыкант і арганізатар Дабродзька Анатолій Аляксеевіч. На сённяшні дзень кафедру музычнага выхавання і харэаграфіі ўзначальвае вядомы не толькі ў Беларусі вучоны і педагог Валянцін Паўлавіч Рэва (з 1986 г.). Кафедра распрацоўвае наступныя навуковыя тэмы: “Актуальныя праблемы музычнага выхавання вучняў і студэнцкай моладзі”, “Эўрыстычныя асновы педагогікі і музычнага выхавання школьнікаў”. Па апошняй тэме абаронена Галяшэвічам Браніславам Алегавічам ў мінулым годзе доктарская дысертацыя.

Аб важнасці музычнага выхавання гаворыць той факт, што ні адна ўрачыстасць не праходзіць без удзелу музыкантаў. Ды і дзень мы пачынаем з песні – гімна Рэспублікі Беларусь, гімнам і заканчваем яго.

Нарэшце, самай маладой па ўзросце на факультэце з'яўляецца кафедра беларускай і рускай моў. Яна ўтворана ў ліпені 1988 года. Кафедру ўзначаліў кандыдат філалагічных навук дацэнт Аляксей Сцяпанавіч Лаўшук. У склад кафедры ўвайшлі вядомыя ў рэспубліцы вучоныя-мовазнаўцы І.А. Блахін, Н.К. Пышкала, Т.Р. Міхальчук. Пазней кандыдацкія дысертацыі абаранілі М.П. Бузук (цяпер ён прарэктар па вучэбнай рабоце ўніверсітэта), Т.В. Капяйко, С.Ф. Іванова, Л.П. Кобзева, В.М. Саўчанка (апошняя, дарэчы, цяпер узначальвае кафедру).

Станаўленне кафедры прыйшлося на 90-я гг. XX ст., калі наша дзяржава толькі-толькі пачынала самастойна функцыянаваць у гэтым бурлівым і непрадказальным свеце. Мы памятаем, у якім стане знаходзілася тады беларуская мова. Нагадаю, што ад беларускай мовы ў рускамоўнай школе вучні вызваляліся зусім, а беларускую літаратуру вывучалі на рускай мове. Мовазнаўцы-беларусаведы нашай кафедры былі задзейнічаны ў стварэнні руска-беларускіх слоўнікаў для патрэб нашага ўніверсітэта (тады яшчэ педагагічнага інстытута), праводзілі курсы па вывучэнні беларускай мовы. Прычым, зазначу, мы ніколі не выступалі за забарону рускай мовы ў нашай дзяржаве. Калі ж улічыць, што кіраўніцтва нашага ўніверсітэта заахвочвала выкладанне дысцыплін па-беларуску, то і не дзіўна, што многія нашы выкладчыкі перайшлі на чытанне курсаў па-беларуску. У некаторых колах існуе думка, што па-беларуску можна чытаць толькі дысцыпліны гуманітарнага напрамку, але праведзены нядаўна ў нашым універсітэце круглы стол, ды і сама практыка паказалі, што і фізіку, і хімію, і матэматыку можна паспяхова выкладаць і па-беларуску, паколькі тэрміналогія інтэрнацыянальная па сваёй сутнасці.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У канцы XX – пачатку XXI ст. кафедра беларускай і рускай моў узяла новы навуковы напрамак – вывучэнне гаворак памежжа: беларуска-рускага і беларуска-польскага. Ёсць ужо шэраг цікавых публікацый. Калектыў аўтараў на чале з дацэнтам кафедры беларускай і рускай моў Людмілай Іванаўнай Шапавалавай падрыхтаваў цікавую лексікаграфічную працу “Слоўнік гаворак магілёўска-смаленскага памежжа”. І калі ў рэальным жыцці граніца раз’ядноўвае народы, то ў даследаваннях вучоных (і філолагаў, і гісторыкаў, і педагогаў) паказваецца, што аб’ядноўвае нашы мовы, нашы сістэмы адукацыі і навуку ў цэлым. Упэўнены, што сённяшняя міжнародная навукова-практычная канферэнцыя яшчэ раз пераканае ўсіх у гэтым.

библиотека МГУ им